**А. М. Ермакова**
Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны

# АРЫФМЕТЫКУ ВУЧЫЦЬ ТРЭБА, АБО ТРАДЫЦЫІ І ІНАВАЦЫІ Ў НАВУЧАННІ ФАНЕТЫЦЫ

«Што вы там, лагарыфмы вучыце ў сваёй школе? – пыталася ў мяне мая бабуля, вясковая настаўніца. – Арыфметыку вучыць трэба!» Што скажаш, бабуля…

У моўнай свядомасці сучаснага чалавека за канцэптам *інавацыі* трывала замацавана нешта новае, адпаведна прагрэсіўнае, тое, што супрацьстаіць старому, коснаму, неэфектыўнаму. Традыцыйнае ўступае ў семантычную апазіцыю, успрымаецца як негатыўнае, рэгрэсіўнае. Адсюль вынікае, што каб палепшыць адукацыйны працэс неабходны інавацыі.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Тэрмін *традыцыя* паходзіць ад лацінскага traditio, што значыць *перадача*, тое што перададзена з мінулага. Трактавацца можа, як тое, што перашкаджае зменам, бессэнсоўна ўзнаўляецца ў грамадстве, не адпавядае сучаснаму стану яго развіцця. Згодна з іншым пунктам гледжання *традыцыі* ўяўляюць сабой элементы сацыякультурнай спадчыны, што перадаюцца ад пакалення да пакалення і захоўваюцца ў грамадстве працяглы час, выступаюць у ролі рэгулятара ўнутрыцывілізацыйных працэсаў.

Пад традыцыямі ў адукацыі разумеюцца выпрацаваныя гісторыяй педагагічнай навукі і практыкі фундаментальныя ідэі, каштоўнасці, прынцыпы, уяўленні, методыкі…, што набылі статус педагагічнай спадчыны. Інавацыі – новае, што забяспечвае абнаўленне сістэмы, якасны рост вынікаў працэсу адукацыі. Інавацыі павінны прайсці праверку часам, бо у адукацыі вынік мае адцягнены характар. І, магчыма, ператворацца ў традыцыю, калі дадуць станоўчы эфект.

Доўгі час лічылася, што каб выправіць аднойчы зробленую арфаграфічную памылку, слова з ёй неабходна механічна прапісаць не менш як сто разоў без памылкі. Адсюль і шматгадзіннае «тупое» перапісванне тэкстаў, механічнае і нерацыянальнае.

Сёння мы тлумачым памылку, выяўляем яе прычыну і не марнуем час на пісаніну. Звяртаемся не да механічнай памяці, а дабіваемся разумення. Лагічна, сучасна, адпавядае духу часу. Толькі пішам чамусьці непісьменна.

Калі ў маўленні дапускаецца арфаэпічная памылка, неабходна патлумачыць яе прычыну, сфармуляваць норму і паўтарыць у спантанным маўленні вялікую колькаць разоў, каб дабіцца аўтаматызму. Ад «механікі» ў навучанні не пазбавіцца, якім бы марнаваннем часу яна не здавалася. Падчас засваення мовы вялікую ролю адыгрывае навучанне фанетыцы, бо ад якасці вымаўлення шмат у чым залежаць камунікатыўныя здольнасці чалавека.

Традыцыйна пачынаем з тэорыі, вывучаем фанетыку як пазіцыйную сістэму, як фаналагічна арганізаванае цэлае. Якаснае засваенне тэорыі дае поўнае ўяўленне аб заканамернай дакладнасці, гарманічнасці гэтай сістэмы. Цэлыя класы гукаў уступаюць у строгія, разумныя, паслядоўныя адносіны. Студэнту прадастаўляецца значны матэрыял для разважанняў, для самастойнага мысленчага працэсу. Студэнт павінен зразумець не свет прадметаў (асобных гукаў), а свет адносін, узаемадзеяння. Пры гэтым уся тэорыя застанецца пустым гукам, калі студэнт не засвоіць азы і не давядзе веданне базавай

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

інфармацыі да аўтаматызму. Вывучаем артыкуляцыю, «намацваем» кожны гук і завучваем, як табліцу множання, пары па звонкасці-глухасці.

Безумоўна, у кожным тэлефоне сёння ёсць калькулятар, і вучыць табліцу множання – марнаваць час! Але без «механікі» аўтаматычнага навыку няма. Без гэтай базы няма сэнсу вучыць лагарыфмы. Праблема сучаснай школы і вышэйшай, і сярэдняй – незасвоеныя азы, «вышэйшую матэматыку» вучым без «арыфметыкі».

Фанетычныя працэсы для студэнта часта застаюцца цьмянымі, і ён спадзяецца толькі на ўласны слых. А слых гэты падводзіць як па прычынах сацыяльных (беларуская мова функцыянуе ва ўмовах білінгвізму), так і па суб'ектыўных.

З праблемай фанематычнага слыху пастаянна сутыкаемся і падчас навучання туркменскіх студэнтаў рускай мове як замежнай. Як патлумачыць ім, што ў рускім слове *конь* апошні зычны мяккі, а у слове кон – цвёрды. Яны не чуюць гэтых гукаў, бо няма адпаведнай артыкуляцыйнай базы.

У працэсе навучання мовам і беларускіх студэнтаў, і туркменскіх, на наш погляд, неабходна больш увагі аддаваць выпрацоўцы фанематычнага слыху ў непасрэднай сувязі з выпрацоўкай артыкуляцыйных навыкаў. Выразная і ўсвядомленая артыкуляцыя дазваляе дакладна вымаўляць гукі, правільна чуць, іншымі словамі фанематычны слых (перцэптыўная база) не развіваецца без навыкаў правільнай артыкуляцыі (артыкуляцыйная база).

Важна, каб была ўсвядомленая сувязь паміж мяккасцю гука і адпаведнай дадатковай артыкуляцыяй (палаталізацыяй), цвёрдасцю – з велярызацыяй, пары па звонкасці-глухасці не завучваліся аўтаматычна, а звязваліся з работай галасавых звязак і прычынамі ўтварэння шуму, гучанне фрыкатыўнага і выбухнога звязвалася з месцам і спосабам утварэння і г.д.

Традыцыйнае і інавацыйнае ў сучаснай адукацыі цесна ўзаемазвязаны. Неабходна захоўваць лепшыя традыцыі і ўзбагачаць навучальны працэс інавацыямі ў адпаведнасці з мэтамі і задачамі адукацыі. Праблему аптымальных суадносін традыцый і інавацый ускладняюць такія фактары, як змяншэнне долі фундаментальных гуманітарных ведаў у агульным аб'ёме прафесійнай падрыхтоўкі, перавага тэарэтычнага блоку над магчымасцю практычнага выкарыстання багажа ведаў і навыкаў, паніжэнне значнасці каштоўнасна-сэнсавых зносін выкладчыка і студэнта.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ